

ГАЛОЎНЫ МАСКВІЧ ПЕРШАГА АЙЧЫННАГА КІНО 9

АРХІТЭКТАР ПАМЯЦІ 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

31 САКАВІКА 2020 г. АЎТОРАК № 62 (29176)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КУНЦЭВІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Тыдзень лесу» — выдатная акцыя, якая штогод аб'ядноўвае вялікую колькасць людзей, галоўным чынам праз свой глыбокі змест. Кожны ўдзельнік мае магчымасць зрабіць свой пасільны ўнёсак у фарміраванне багацця наступных пакаленняў беларусаў. Гэта своеасаблівае пасланне тым, хто прыйдзе сюды пасля нас. Яго сэнс зводзіцца да простых ісцін: берагчы прыроду, заўсёды думаць пра тое, што застанецца пасля нас, і любіць нашу краіну».*

# БЯРОЗАВІК У ЗАПАС



Фота БелТА.

**Аператар Юрый ЖЫЖЫЯ кантралюе якасць прадукцыі.**

**На Быхаўскім кансервава-агароднінасушыльным заводзе цяпер кансервуюць бярозавы сок новага «ўраджаю». Прычым выпрацоўваюць яго па ўласных адмысловых рэцэптах, дадаючы чарнічны сок, шыпшыну, чабор, святаяннік, мелісу.**

## КОРАТКА

● **Алімпіяда ў Токіа пачнецца 23 ліпеня 2021 года, Параалімпіяда — 24 жніўня.**



● ЕС у сувязі з каранавірусам накіраваў 840 мільёнаў еўра краінам «Усходняга партнёрства».

● **Нацбанк рэкамендуе банкам пры рэструктурызацыі запазычанасці па крэдытах не павялічваць працэнты.**

● Раннія яравыя пасеялі ў Беларусі больш чым на 35 % плошчаў.

● **Музей гісторыі ВАВ запусціў анлайн-лекцыі для навучэнцаў.**

● У Беларусі больш за 22 тысячы сем'яў палепшылі жыллёвыя ўмовы ў 2019 годзе.

● **Беларусь абмяркоўвае з МВФ прыцягненне фінансавання ў сувязі з пагаршэннем глабальнай эканамічнай сітуацыі.**

Тэорыя і практыка

## ЭЛЕКТРАМАБІЛЬ: КВІНТЭСЕНЦЫЯ ТЭХНАЛОГІЙ

Калі Беларусь складзе канкурэнцыю TESLA, чаму «гібрыды» не вельмі цікавяць пакупнікоў і як зрабіць «разумную» машыну маленькай?



Аляксандр БЯЛЕВІЧ *(злева)* у лабараторыі бартавых мехатронных сістэм мабільных машын.

СТАР. 5

75 мірных гадоў. Беларусь памятае!

Успомніць усіх

## КАЛІ ГІСТОРЫЯ СТАНОВІЦЦА БРЭНДАМ?

### РАЗАМ МЫ СТВОРЫМ НАРОДНЫ ЛЕТАПІС ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**75 гадоў мы жывём са словамі «Ніхто не забыты, нішто не забыта». Запісаны тысячы ўспамінаў, вучоныя не спыняюць даследаванні і друкуюць працы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, выдадзена 146 тамоў кніг «Памяць», настаўнікі заахвочваюць дзяцей да даследчыцкай работы, архівы друкуюць зборнікі з дакументамі, аблічбаваныя копіі выстаўляюцца ў інтэрнэт (толькі ў электроннай базе «Партызаны Беларусі» ў найбліжэйшыя гады плануецца выкласці сотні тысяч адсканіраваных дакументаў). І тым не менш гісторыя апошняй вайны ўсё яшчэ не вывучана цалкам, не ўсе ўдзельнікі згаданы, з ростам колькасці кніг не расце цікавасць моладзі да мінулага, і ўсё часцей узнімаецца пытанне пра тое, што цяпер трэба ўжо абараняць наша права на Перамогу.**

**«Сёння савецкі салдат на Захадзе падаецца як гвалтаўнік, варвар, усё менш кажуць, што гэта вызваліцель, разбураюцца помнікі нашым бацькам і дзядам. 34 мільёны маладых здаровых мужчын было прызвана на фронт. Хто прымушаў іх ісці на таран, закрываць сваім целам дзоты? Гэта быў іх выбар. І сёння мы хочам узняць грамадскасць на высакародную справу: успомніць усіх», — тлумачыць сутнасць ідэі гісторыкаў акадэмік, сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі Беларусі Аляксандр КАВАЛЕНЯ.**

СТАР. 7

ISSN 1990 - 763X

20062

9771990763008

ЗВЯЗДА. Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Вы яшчэ паспяваеце падпісацца на «Звязду» на II квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

З першых вуснаў

# «Міратворчасць — тая лінія, па якой мы заўсёды мусім супрацоўнічаць з усімі»

## На нарадзе ў Прэзідэнта абмеркавалі ваенную бяспеку дзяржавы

**Кіраўнік дзяржавы вывучыў стан спраў у беларускай арміі ўвогуле і злабадзённае пытанне — рэагаванне на вучэнні НАТА «Абаронца Еўропы — 2020» — у прыватнасці. Яшчэ летась Аляксандр Лукашэнка даручыў выпрацаваць адэкватныя меры, прычым ні ў якім выпадку не празмерныя, на што кіраўнік дзяржавы зноў звярнуў увагу.**

***«Я не хацеў бы, каб гэта ўспрымалі як бразганне зброяй з нашага боку.*** Мы на сённяшні дзень вучэнне НАТА, якое праводзіцца ў непасрэднай блізкасці ад нашых граніц, так не ўспрымаем — яшчэ і таму, што ***яны значна адступілі ад сваіх першапачатковых планаў»,*** — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Адпаведныя дзеянні беларускіх сілавікоў Прэзідэнт запатрабаваў уплесці ў жыццё арміі. Работа мусіць пайсці на карысць, а не стаць паказушнай.

Прэзідэнт інфармаваны, што беларуская армія жыве, як ёй і належыць, мерапрыемствы не пераносяцца і не адмяняюцца, праведзены вучэнні міратворчых падраздзяленняў Узброеных Сіл Беларусі і Вялікабрытаніі.

«Водгукі станоўчыя, думаю, што ***гэта нікога не павінна напружваць. Мір нам патрэбны, і міратворчасць — тая лінія, па якой мы заўсёды мусім супрацоўнічаць з усімі.*** Думаю, наш асноўны партнёр — Расійская Федэрацыя — у гэтым кірунку абароты не зніжае, і не толькі па лініі міратворчасці», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Нагадаўшы пра актуальную ў грамадстве тэму распаўсюджвання новай каранавіруснай інфекцыі, Прэзідэнт пацікавіўся і станам здароўя ваеннаслужачых, асабліва афіцэрскага складу, які кантактуе са «знешнім светам».

Дзяржсакратар Савета бяспекі Андрэй Раўкоў, міністр абароны Беларусі Віктар Хрэнін і начальнік галоўнага разведвальнага


Фота БелТА.

ўпраўлення — намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі Павел Ціханаў далажылі Аляксандру Лукашэнку аб дзеяннях з боку блока НАТА, далі свае ацэнкі рабоце і ўнеслі прапановы.

### ВЫКАНАЦЬ ЛЮБУЮ ЗАДАЧУ

Віктар Хрэнін праінфармаваў кіраўніка дзяржавы, што інтэнсіўнасць вучэнняў НАТА «Абаронца Еўропы — 2020» з 16 сакавіка зніжана ў сувязі са складаным эпідэміялагічным становішчам. Германія, Італія, Нідэрланды адмовіліся ад правядзення вучэнняў, Вялікабрытанія цалкам скарачае і адводзіць сілы і сродкі. Шэраг сумежных вучэнняў на тэрыторыі Літвы, Латвіі, Эстоніі адменены.

***«Аднак ніякіх заяў аб тым, што гэтыя вучэнні спынены, дагэтуль няма.*** Падраздзяленні Злучаных Штатаў і НАТА на ратацыйнай аснове каля нашых граніц таксама прысутнічаюць. Таму ***мы працягваем планава падрыхтоўку сваіх Узброеных Сіл,*** мерапрыемствы праводзім самастойна, без чыёйсьці дапамогі, на сваёй тэрыторыі», — паведаміў журналістам міністр абароны.

Віктар Хрэнін назначаны на пасаду 20 студзеня. Ён далажыў Прэзідэнту, што са становішчам ва Узброеных Сілах разабраўся.

«На сённяшні дзень можна сказаць дакладна і ўпэўнена, што ***Узброеныя Сілы кіраваныя, боегатоўныя, узровень воінскай дысцыпліны і маральна-псіхалагічнага стану дазваляе выканаць любую задачу»,*** — упэўнены міністр.

Кіраўнік абароннага ведамства далажыў Прэзідэнту аб кірунках работы, на якіх засяродзіць далейшыя намаганні, і аб падрыхтоўцы Парада да 75-годдзя Перамогі.

Што да стану здароўя салдат і афіцэраў Узброеных Сіл, Віктар Хрэнін праінфармаваў, што панікі з нагоды каранавіруса не назіраецца.

«На дзесяці палігонах дзейнічае каля 7,5 тысячы асабовага складу. Яны ўсе цалкам здаровыя і здольныя выконваць задачы. ***Праблем з распаўсюджваннем каранавіруса ва Узброеных Сілах няма, аднак мы не расслабляемся: нашы санітарна-эпідэміялагічныя службы, медыкі знаходзяцца ў павышанай гатоўнасці,*** каб хутка, кваліфікавана і якасна аказваць дапамогу», — расказаў Віктар Хрэнін.

Па словах міністра, па стане на панядзелак ва Узброеных Сілах няма ніводнага выпадку заражэння каранавірусам.

### УСЁ ПА ПЛАНЕ

Вакол Беларусі ў цяперашні час праводзіцца тры аперацыі: Аб'яднаных узброеных сіл НАТА «Пашыраная перадавая прысутнасць» (чатыры батальёны тактычнай групы), узброеных Сіл ЗША «Атлантычная рашучасць» (дзве баявыя брыгадныя групы) і місія па ахове паветранай прасторы. Пра гэта журналістам паведаміў начальнік галоўнага разведвальнага ўпраўлення — намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі Павел Ціханаў.

«На гэтым фоне планаваліся і ўжо праводзяцца вучэнні «Абаронца Еўропы — 2020», і фактычна цяпер завяршаецца першы этап — перакідванне. Другі этап планаваўся 22 красавіка — 22 мая, але з прычыны пандэміі кіраўніцтва ЗША і Аб'яднаных узброеных сіл НАТА карэктуе (ход вучэнняў. **— «Зв.»**), і замест перакінутых трох баявых брыгадных груп рэальна цяпер размешчана ў Германіі, Польшчы адна баявая брыгадная група», — растлумачыў начальнік разведупраўлення. Праз каранавірус адменены чатыры вучэнні, і Павел Ціханаў мяркуе, што гэта не апошнія змяненні на актыўным этапе аперацыі.

«Нас не можа не хваляваць, калі ў нас блізка ад граніц знаходзяцца групіроўкі іншых узброеных сіл. Але разам з тым мы праводзім планавыя мерапрыемствы, адпрацоўваюцца ўсе пытанні. Усё ажыццяўляецца планава», — падкрэсліў Павел Ціханаў.

**Варвара МАРОЗАВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Распаўсюджванне каранавіруса ў Кітаі ўдалося спыніць



З адпаведнай заявай падчас брыфінгу выступіў Мі Фэн, які з'яўляецца афіцыйным прадстаўніком Дзяржкамітэта па пытаннях аховы здароўя КНР. Пра гэта паведаміла інфармацыйнае агенцтва «Сіньхуа». Колькасць унутраных выпадкаў заражэння склала менш чым 3 тысячы. У мацерыковым Кітаі фіксуецца мінімальны ўзровень распаўсюджання COVID-19. Пры гэтым афіцыйны прадстаўнік Дзяржкамітэта па пытаннях аховы здароўя КНР адзначыў, што новы віток барацьбы з вірусам у Кітаі магчымы, бо колькасць завозных выпадкаў працягвае расці. Іх зафіксавана амаль 700 з 42 краін, удакладніў Мі Фэн.

### Паўночная Македонія ўвайшла ў НАТА



Паўночная Македонія стала 30-м членам НАТА, яе сцяг узнялі над штаб-кватэрай альянсу ў Бруселі. Балканская дзяржава здала на захоўванне ў Дзярждэпартамент ЗША пасведчанне аб прыёме ў альянс. «Паўночная Македонія з гэтага часу з'яўляецца членам сям'і з 30 краін і амаль мільярда чалавек», — заявіў генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг. Уступленню ў альянс краіны з насельніцтвам 2,1 мільёна чалавек доўгі час перашкаджала спрэчка з Грэцыяй. Афіны асцерагаліся, што дзяржава з назвай Македонія можа прад'явіць тэрытарыяльныя прэтэнзіі да аднайменнай грэчаскай правінцыі. Толькі пасля таго, як Скоп'е ў чэрвені 2018 года пагадзіўся змяніць назву краіны на Паўночную Македонію, перашкода да ўступлення ў НАТА была ліквідавана.

### Эксперты папярэдзілі, што праз тры месяцы нафту не будзе куды падзець



Па разліках кансалтынгавай кампаніі IHS Markit, бягучыя тэмпы попыту і прапановы азначаюць, што запасы павялічацца больш чым на 1,8 мільярда барэляў пасля першай паловы 2020 года. Калі ўлічыць, што магутнасцяў для захоўвання па-ранейшаму даступна толькі каля 1,6 мільярда барэляў, вытворцы будуць вымушаныя скарачаць яе выраб. Інакш у чэрвені не будзе месца, каб складаваць нафту. Vitol Group і Gunvor Group, два вядучых сусветных трэйдары, заўважаюць, што ёсць вялікая цікавасць да сродкаў яе захоўвання. Некалькі трэйдараў замовілі супертанкеры, каб захоўваць нафту ў моры. Прапанова можа перавысіць попыт на 12,4 мільёна барэляў у суткі ўжо ў другім квартале. «Здабычу варта скарацiць ці нават спыніць. Цяпер толькі пытанне — дзе і наколькі», — падкрэсліў кіраўнік падраздзялення па нафтавых рынках IHS Джым Буркхард.

Шануй сваё!

# «МОВА» — у скверы Адама Міцкевіча

**Гэтай вясной у шасці найбуйнейшых гарадах Беларусі размесцяць серыю арт-інсталяцый — набораў інтэрактыўных скульптур, якія разам утвараюць манументальнае слова «МОВА». У Мінску яны з'явяцца ў скверы Адама Міцкевіча. Таксама арт-аб'екты ўпрыгожаць вуліцы Брэста, Віцебска, Гродна, Гомеля і Магілёва. Праект рэалізуецца адным з мабільных аператараў сумесна з ініцыятывай «Веліч роднай мовы».**




Кожная з літар у інсталяцыі ўяўляе з сябе вулічную мэблю з дрэва і металу, на якой можна з камфортам размясціцца, і мае свой колер — у гэтым галоўная адметнасць праекта. Па задуме аўтара арт-аб'ектаў, вядомага беларускага скульптара Паўла Вайніцкага, колеравыя гамы скульптур ва ўсіх гарадах унікальныя. Яны падбіраліся так, каб паказаць мясцовыя культурныя, гістарычныя і ландшафтныя адметнасці.

Чырвоны, чорны, зялёны, жоўты ці залацісты, шэры і розныя адценні сіняга — асноўныя колеры, якія цягам стагоддзяў атачалі беларусаў у побыце, архітэктуры і прыродзе. Гэта адлюстравана ў даследаваннях, на якіх грунтуецца ідэя праекта «МОВА», — канцэпцыі нацыянальных колеравых упадабанняў дызайнера, мастака і паэта Міхала Анемпадыстава (апісана ім у кнізе «Колер Беларусі»), а таксама рэканструкцыях народных строяў этнографа Міхаіла Раманюка.

Мінск — геаграфічны, сацыяльны і культурны цэнтр краіны, дзе перамешваюцца асаблівасці розных рэгіёнаў. Таму для інсталяцыі ў сталіцы выбраны ўсе асноўныя колеры — сіні, зялёны, жоўты, чырвоны і чорны. Скульптурныя літары «МОВА» з'явяцца на перасячэнні вуліц Гарадскі Вал і Няміга — у скверы Адама Міцкевіча, аднаго з выдатных паэтаў эпохі рамантызму, які апісваў у сваіх творах прыгажосць беларускай зямлі.

У Брэсце інсталяцыя будзе усталявана на перасячэнні вуліцы Савецкай і набярэжнай Францыска Скарыны, у Віцебску — на вуліцы Леніна перад мастом 1000-годдзя горада, у Гродне — на вуліцы Маставой, на вуліцы Кірава — у Гомелі, на Траецкай набярэжнай у Магілёве.

Ва ўсіх гарадах арт-аб'екты плануецца ўсталяваць да канца вясны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

2 красавіка 2020 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.

На слыху

# 47 ПАЦЫЕНТАЎ ПАПРАВІЛІСЯ

**Колькасць зафіксаваных у Беларусі выпадкаў COVID-19 павялічылася да 152. Пры гэтым выпісаны ці чакаюць выпіскі 47 чалавек, якія раней мелі станоўчы тэст на COVID-19, а 105 працягваюць медыцынскае назіранне і лячэнне.**

— Вядзецца кантроль за эпідэміялагічнай абстаноўкай, якая складваецца, і ў выпадку неабходнасці пацыенты шпіталізуюцца для далейшага назірання і абследавання. Такім чынам толькі за апошнія суткі шпіталізавана 110 чалавек, выпісана — 144, у тым ліку і тых, хто меў кантакты з носьбітамі інфекцыі, — паведаміла **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН.**

У Беларусі на сённяшні дзень праведзена больш за 30 тысяч тэстаў на каранавірусную інфекцыю. Нагадаем, на мінулым тыдні міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік паведаміў, што Беларусь уваходзіць у дзясятку краін свету, дзе зроблена найбольшая колькасць тэстаў (з разліку на адзін мільён насельніцтва).

**Алена КРАВЕЦ.**

Прыёмная кампанія — 2020

## Сустрэчы з абітурыентамі — у анлайн-рэжыме

**Як паведаміла прэс-служба БДПУ, з 31 сакавіка да 3 красавіка факультэты і інстытуты ўстановы правядуць Дні адкрытых дзвярэй. Сёлета з улікам эпідэміялагічнай сітуацыі яны пройдуць у анлайн-рэжыме.**

Абітурыенты і іх бацькі змогуць у чаце задаць пытанні дэканам факультэтаў, дырэктарам інстытутаў, выкладчыкам, студэнтам, каб даведацца ад іх пра асаблівасці паступлення і навучання, навуковае, культурнае і спартыўнае жыццё ў ВНУ.

Акрамя таго, 4 красавіка ў 11.00 распачнецца анлайн-канферэнцыя з прыёмнай камісіяй. Абітурыентам і іх бацькам раскажуць аб правілах, тэрмінах і кантрольных лічбах прыёму, прахадных балах мінулага года і льготах пры паступленні.

Падрабязную інфармацыю пра тое, у каторы час на якім факультэце адбудзецца анлайн-сустрэча з абітурыентамі, са спасылкамі на падключэнне можна знайсці на сайце ўніверсітэта.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Размеркаванне адбудзецца, а практыку могуць перанесці

**Міністр адукацыі Ігар Карпенка правёў рабочую нараду з рэктарамі вышэйшых навучальных устаноў, начальнікамі абласных упраўленняў адукацыі і камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама па выніках праведзенага Нацыянальным прэс-цэнтрам стрыма «Задайце пытанне міністру аховы здароўя і прадстаўніку Міністэрства адукацыі». Пра гэта паведаміла прэс-служба ведамства.**

З улікам пытанняў, якія паступілі, кіраўнік галіны адзначыў, што неабходна дакладна і граматна скарэкціраваць работу ўсіх устаноў адукацыі і ў абавязковым парадку выконваць рэкамендацыі міністэрстваў аховы здароўя і адукацыі.

Ён нагадаў, што ў навучальных установах быў рэалізаваны цэлы комплекс мер, накіраваных на прафілактыку і мінімізацыю кантактаў, — ад адмены ці пераносу на пазнейшыя тэрміны масавых мерапрыемстваў да карэкціроўкі графіка заняткаў. ВНУ пасунулі час іх пачатку, каб не дапускаць у гадзіны пік перапоўненага транспарту і падзяліць патокі пасажыраў, якія едуць на работу і вучобу.

Разам з тым, як адзначыў Ігар Карпенка, трэба падыходзіць індывідуальна да вырашэння любых пытанняў, якія датычацца здароўя, вучобы, пражывання навучэнцаў і студэнтаў, работы выкладчыкаў і ўсіх супрацоўнікаў навучальных устаноў. У інтэрнатах няўхільна павінен выконвацца пропускны рэжым.

Падчас стрыму ў прадстаўніка Міністэрства адукацыі запыталіся, ці будзе пераносіцца размеркаванне? Прагучаў адказ, што яго плануецца правесці ў вызначаныя тэрміны, але пры гэтым было рэкамендавана падзяліць студэнтаў на малакольскасныя групы. Таксама ВНУ, сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы атрымалі рэкамендацыю аптымізаваць месца прахоДжання практыкі, а пры неабходнасці перанесці яе на пазнейшыя тэрміны.

Студэнтаў таксама хвалявала пытанне іх вызвалення ад заняткаў і адпрацоўкі за пропускі. У Міністэрстве адукацыі адказалі, што кіраўнікам устаноў адукацыі рэкамендавана максімальна індывідуалізаваць гэты працэс з улікам прычын пропуску, а таксама ствараць умовы для адпрацовак прапушчаных заняткаў без аплаты. Пры неабходнасці тэрміны правядзення залікаў і экзаменаў таксама могуць быць скарэкціраваныя.

Што датычыцца правядзення ў краіне рэпетыцыйнага тэсціравання (далей — РТ), то яго тэрміны былі пасунутыя на май. Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў праінфармаваў на сваім сайце, што ў шэрагу пунктаў правядзення РТ магчымыя адмены і перанос абвешчаных раней сеансаў правядзення РТ на пазнейшыя тэрміны.

У выпадку адмены сеансаў РТ плата за іх будзе вернута ў асабісты кабінет абітурыента на сайце РІКВ. Наяўныя свабодныя аплаты можна будзе выкарыстаць, каб сфарміраваць заяўку для ўдзелу ў РТ у іншыя дні у любым з пунктаў правядзення тэсціравання.

Інфармацыя пра новыя даты правядзення рэпетыцыйнага тэсціравання ўводзіцца ў сістэму рэгістрацыі ўдзельнікаў РТ самімі пунктамі правядзення тэсціравання пасля таго, як яны вызначаюцца з графікам. У гэтай сувязі абітурыентаў папрасілі саміх адсочваць інфармацыю пра актуальныя даты правядзення РТ у сваіх асабістых кабінетах на сайце РІКВ або звяртацца ў абраную ўстанову адукацыі (пункт тэсціравання) на тэлефоны, даступныя ў асабістым кабінеце удзельніка або на сайце РІКВ у раздзеле «РТ»/«Пункты правядзення РТ».

Рашэнне аб пераносе цэнтралізаванага тэсціравання і прыёмнай кампаніі Міністэрствам адукацыі не прымалася.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

# АМАЛЬ ЗІМА, НЕ ПА СЕЗОНЕ...

## Уначы да мінус 10, а ўдзень — мокры снег з дажджом

**На гэтым тыдні мокры снег з дажджом у нас будзе не ў рэдкасць, паведамляюць эксперты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У першы дзень красавіка ўначы ў асноўным будзе без ападкаў, а раніцай і ўдзень адаб'ецца ўплыў франтальнага падзелу — пераважна па паўночнай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай на асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер прагназуецца заходні ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да мінус 8 градусаў, па паўднёвым усходзе пры праясненнях — да мінус 10 градусаў. Удзень будзе таксама холадна — усяго толькі ад плюс 2 градусаў да 9 цяпла. Спецыялісты Белгідрамета адзначаюць, што падобны тэмпературны фон адпавядае першым чыслам сакавіка.

Праўда, такі жорсткі холад працягнецца нядоўга. Ужо ў чацвер умовы надвор'я ў Беларусі будуць фарміраваць франтальныя падзелы ад атлантычнага цыклону, які трымае шлях на Скандынаўскі паўвостраў. Халодное паветра пакіне краіну, і тэмпературны рэжым паступова вернецца да кліматычнай нормы. Будзе шмат аблокаў. На значнай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах месцамі галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — 5—10 цяпла.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, у пятніцу пад уплывам няўстойлівых вільготных акіянічных паветраных мас уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 3 градусаў. Удзень будзе 6—12 цяпла, па паўднёвым усходзе Гомельскай вобласці — ад плюс 8 градусаў да 14 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Амаль 1,5 тысячы рэцэптаў даставілі валанцёры БРСМ пажылым мінчанам

**За мінулы тыдзень 1466 рэцэптаў, неабходных для далейшага лячэння пажылых людзей з хранічнымі захворваннямі, даставілі са сталічных паліклінік адрасатам добраахвотнікі Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.**


brsm.by

Тэрытарыяльныя камітэты штодня звязваюцца з паліклінікамі сваіх раёнаў, дамаўляюцца, дзе і калі можна забраць рэцэпты. Затым валанцёры, экіпіраваныя ахоўнымі сродкамі, забіраюць спакаваныя ў персанальныя канверты рэцэпты і разносяць іх па ўказаных адрасах. Пры іх перадачы добраахвотнікі выкарыстоўваюць бескантактавы спосаб — усе канверты апускаюцца ў паштовыя скрыні пасля папярэдняга званку.

Акрамя таго, пры тэрытарыяльных камітэтах БРСМ працуе больш за 150 гарачых маладзёжных ліній. Яны функцыянуюць штодня з панядзелка да суботы ўключна з 9.00 да 18.00.

Тэлефоны абласных гарачых ліній: у Брэсце — 8 (0162) 2-11-591, Віцебску — 8 (0212) 6-62-087, Гомелі — 8 (0232) 5-63-315, Гродна — 8 (0152) 7-19-833, Магілёве — 8 (0222) 7-66-782. У буйных гарадах, напрыклад, Мінскай вобласці: Салігорску — 8 (0174) 2-00-345, Слуцку — 8 (01795) 7-50-80, Маладзечна — 8 (0177) 7-49-501. У Мінску тэлефон гарачай лініі 8 (017) 284-85-54.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Будзьце пільнымі!

# Выманіла больш за 200 тысяч долараў

**Жыткавіцкі раённы аддзел СК завяршыў расследаванне крымінальнай справы аб махлярстве ў дачыненні да 47-гадовай экс-работніцы банка.**

**Як паведамляе УСК па Гомельскай вобласці, па версіі следства жыхарка райцэнтра з 2016 да 2019 года шляхам падману і злоўжывання даверам завалодала больш чым 200 тысячамі долараў. Пацярпелымі па справе прызнаны 12 чалавек.**

Да 2013 года фігурантка па справе доўгі час працавала ў мясцовым філіяле банка. Затым стала выкарыстоўваць гэты факт у ашуканскіх схемах. Яна пераконвала даверлівых грамадзян перадаць ёй валютныя зберажэнні нібыта для афармлення выгаднага ўкладу з высокімі працэнтнымі стаўкамі па месцы яе мінулай работы. Жанчына запэўнівала, што былыя калегі па яе просьбе могуць размясціць грошы на асаблівым укладзе, даступным толькі для работнікаў банка. Устаноўлена, што гэта не адпавядала рэчаіснасці: у банку адсутнічаюць асаблівыя ўклады для сваіх супрацоўнікаў.

У 2016 годзе адна з пацярпелых перадала экс-работніцы банка для ўкладу 50 тысяч долараў і кожны месяц стала атрымліваць вусныя справаздачы аб нібыта наліченых працэнтах. На працягу наступных двух гадоў фігурантка пад маркай папаўнення ўкладу выманіла ў даверлівай грамадзянкі дадаткова больш за 50 тысяч долараў. Калі жанчына запатрабавала назад усе ўкладзеныя грошы, абвінавачаная вярнула толькі 12 тысяч.

Яшчэ адзін пацярпелы паддаўся на іншую прапанову — укласці грошы ў звязаны з перавозкай драўніны бізнес сяброў абвінавачанай. «Інвестару» абяцалі выплачваць кожны месяц 10 працэнтаў ад укладзенай сумы і абвясцілі магчымасць у любы час вывесці грошы «са справы». Мужчына перадаў махлярам 7 тысяч долараў, вярнуць атрымалася толькі малую частку сумы.

У праваахоўныя органы сталі паступаць заявы ад іншых падманутых грамадзян. Жыткавіцкі раённы аддзел СК распачаў крымінальную справу для высвятлення ўсіх абставін.

На допыце фігурантка расказала, што патраціла грошы на асабістыя патрэбы і вяртанне даўгоў. Падчас вобыску ў яе дома выяўлены дакументы на набыццё бытавой тэхнікі, ювелірных вырабаў і мэблі. Жанчына ўсе гэтыя тавары прадала, каб часткова вярнуць даўгі. У ходзе следства жанчына вярнула пацярпелым больш за 30 тысяч долараў. На яе маёмасць на суму звыш 130 тысяч рублёў накладзены арышт.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокія спачуванні намесніку начальніка Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Кузураву Дзмітрыю Уладзіміравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**ААТ «Парытэтбанк» выказвае глыбокія спачуванні калегам, родным і блізкім у сувязі з раптоўнай смерцю 29 сакавіка 2020 года Аляксандра Васілевіча КУЧЫНСКАГА, старшыні Асацыяцыі беларускіх банкаў, якую ён узначальваў з 2017 года.**

**За сваю шматгадовую плённую дзейнасць Аляксандр Васілевіч КУЧЫНСКІ зрабіў значны ўнёсак у фінансава-банкаўскую сферу Беларусі, развіццё банкаўскіх структур, умацаванне міжнароднага партнёрства, а таксама вёў актыўную работу па абароне правоў і законных інтарэсаў работнікаў банкаўскіх устаноў і адзначаны за свой прафесіяналізм шматлікімі ўзнагародамі.**

**Мы запомнім Аляксандра Васілевіча КУЧЫНСКАГА як ініцыятыўнага, энергічнага і харызматычнага кіраўніка, прафесіянала сваёй справы і цудоўнага чалавека.**

Блізкая ўлада

# АСАБЛІВАСЦІ ЖЫЦЦЯ ВА ЎМОВАХ ЭПІДЭМІІ

**На прамую лінію да старшыні Брэсцкага аблвыканкама Анатоля ЛІСА змаглі дазваніцца 32 жыхары вобласці. Тэлефонныя абаненты закранаці розныя тэмы, але многія са зваротаў датычыліся галоўнай цяперашняй праблемы — жыцця ва ўмовах пандэміі.**



Фота БелТА.

Як вядома, нямала нашых грамадзян працуе ў Еўропе. Напрыклад, дальнабойшчыкі занятыя вахтавым метадам, яны працуюць пэўны адрэзак часу, потым прыязджаюць на адпачынак. Тыя, каго закрыццё граніц заспела дома, выехаць не змаглі. Цяпер яны фактычна засталіся без работы і без даходаў. Гэту праблему ўзнялі малады брастаўчанін у гутарцы з губернатарам. Мужчына пацікавіўся, што могуць прапанаваць службы занятасці такім грамадзянам. Вядома, адказаць адразу на падобнае пытанне немагчыма. І паколькі прамая лінія праходзіла ў рэжыме відэаканферэнцыі, а на сувязі былі таксама старшыні гар- і райвыканкамаў, праблему ўзялі на заметку.

Дзяўчына, гаспадыня кавярні ў цэнтры горада, скардзілася, што зусім няма наведвальнікаў, у асобныя дні іх стала ў чатыры разы меней, чым звычайна. Вядома, яна церпіць страты. Але ж у такой сітуацыі застаецца толькі перачакаць навалу.

## Дробных пытанняў не бывае

Традыцыйныя прамыя лініі, якія праводзяць аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам, прайшлі ў мінулую суботу.

Стан дваровых тэрыторый і вайсковых могілак, затрымкі з выплатай заработнай платы, «шумнае суседства» з прадпрыемствам, павышэнне тарыфаў на ацяпленне, перабоі з работай мабільнай сувязі, недахоп месцаў для парковак... Тэмы, як заўсёды, узнімаюцца розныя. Адна з галоўных гэтым разам — асаблівасці жыцця ва ўмовах эпідэміі каранавіруса і закрыцця граніц іншымі краінамі. Многіх людзей непакоіць нявызначанасць з работай і будучымі заробкамі. У такой сітуацыі ад улад патрабуецца не толькі ўменне хутка і эфектыўна рэагаваць на ўзнятую праблему, але і цярпенне, і ўважлівасць, і тактоўнасць... Як з гэтым спраўляліся кіраўнікі абласцей, назіралі нашы спецыяльныя карэспандэнты.

І калі жыхары гарадоў больш заклапочаныя асаблівасцямі жыцця ва ўмовах пандэміі, то вясковыя людзі займаюцца звычайнымі для гэтай пары года клопатамі. З Жабінкаўскага раёна, напрыклад, паступіў званок наконт распрацоўкі пясчанага кар'ера. Вядома, пясок — патрэбны матэрыял для будаўніцтва. Але ж праз вёску Рачкі ўвесь час ідуць вялікагрузы. Машыны не толькі ўздымаюць пыл, яны ствараюць і дадатковую небяспеку, а хутка лета, дзеці прыедуць на канікулы. З Маларыцкага раёна паскардзіліся на перабоі ў рабоце мабільнай сувязі. Па кожным з названых зваротаў службовыя асобы атрымалі ўказанні.

Летась у Лелікаве Кобрынскага раёна згарэла старадаўняя царква. Прыхаджанка з гэтай вёскі прасіла губернатара паспрыяць аднаўленню храма.

Важную для многіх праблему ўзняў жыхар абласнога цэнтра. Каля абласной клінічнай бальніцы крытычна не хапае месца для паркоўак. Заяўніку на працягу пэўнага часу давялося вазіць у абласную кансультатыўную паліклініку пажылога чалавека, які амаль не можа хадзіць, а высадзіць яго каля ўвахода было немагчыма. Аўтар звароту адразу прапанаваў зрабіць стаянку для медыкаў на пустцы ў раёне станцыі пераліванія крыві. Тады стала б магчыма крыху разгрузіць пад'езды да паліклінікі і галоўных карпусоў бальніцы. Так ці інакш, праблему трэба вырашаць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# СЛУХАЦЬ УВАЖЛІВА. ВЫРАШАЦЬ ХУТКА

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ падчас трохгадзіннай прамой лініі выслухаў каля дваццаці пяці заяўнікаў.**



Фота Алега КПІМОВІЧА.

Некалькі званкоў датычыліся затрымак з выплатай зарплаты ў арганізацыях аграрнага сектара. Губернатар паабяцаў, што літаральна праз пару дзён праблема будзе знятая, адпаведныя даручэнні ўжо дадзены.

Неаднаразова тэлефанавалі жыхары прыватнага сектара абласнога цэнтра. Адзін з гараджан паведаміў, што да дамоў вуліцы, дзе ён жыве, не пракладзена оптавалаконная лінія. У «Белтэлекаме», як сцвярджае мужчына, спасылаюцца на тое, што выдаткі пры правядзенні неабходных работ ніколі не акупяцца. А нерэнтабельна, дык і няма неабходнасці там нешта рабіць — такая логіка ў сувязістаў. Губернатар паабяцаў, што з праблемай разбяруцца. А новаму мэру Віцебска наогул параіў шчыльна заняцца добраўпарадкаваннем мікрараёнаў з аднапавярховымі забудовамі.

Мікалай Шарснёў таксама даручыў удзяліць увагу стану дваровых тэрыторый у Віцебску, асабліва — дзіцячых пляцовак. Жыхарцы горада, якая паведаміла пра праблемны двор на вуліцы Чкалава, ён паабяцаў, што ў «дзіцячым гарадку» стане больш аб'ектаў для забаў.

Жыхарка Оршы папрасіла захаваць рэжым работы банкаўскага пункта, як раней, раз у тыдзень: без яго — нікуды, бо да найбліжэйшага аддзялення банка ехаць сем прыпынкаў на грамадскім транспарце... У райвыканкаме паведамілі, што па банкаўскія паслугі за месяц туды звярталіся максімум дзевяноста чалавек. Таму ў банку і вырашылі закрыць «офіс». А ў параўнальна вялікім памяшканні запланавана зрабіць краму. Магчыма, будзе мэтазгодным усталяваць там інфакіёск і банкамат...

Яшчэ адна жыхарка Оршы паскардзілася на шумнае суседства з прадпрыемствам па перапрацоўцы драўніны. Старшыня райвыканкама растлумачыў, што спецыялісты не выявілі праблем. Але ж, канешне, можа яшчэ раз разабрацца падчас выезду.

Жыхар з Віцебскага раёна паскардзіўся на дрэнны, на яго погляд, стан самых буйных у краіне вайсковых могілак, дзе пахавана каля 17 тысяч чалавек. Кіраўнік раённай вертыкалі ўлады сцвярджае, што пра гэта месца не забываюць. Але губернатар вырашыў убачыць на свае вочы, каб упэўніцца, хто мае рацыю: заяўнік ці чыноўнік.

Жыхарка райцэнтра Шуміліна прасіла парады: што зрабіць, каб у старым доме, у якім восем кватэр, пячное ацяпленне замянілі на цэнтралізаванае. Праблема ў тым, што цяпер нельга фінансаваць такія работы з бюджэту. А 1500—1700 долараў у эквіваленце жыльцам, большасць з якіх пенсіянеры і інваліды, заплаціць нават у растэрміноўку даволі праблематычна. Улада раёна ў курсе праблемы, і такі дом не адзін. Губернатар прапанаваў прадумаць, як можна дапамагчы ў гэтай сітуацыі.

Пасля прамой лініі старшыня Віцебскага аблвыканкама па відэасувязі звярнуўся да падначаленых у раёнах з заклікам уважліва выслухоўваць землякоў. Няма дробных пытанняў і праблем у рабоце з людзьмі. І ўсе яны будуць знаходзіцца на губернатарскім кантролі.

Дарэчы, падчас мінулай прамой тэлефоннай лініі, праведзенай 23 лістапада 2019 года, былі дадзены 33 даручэнні, 27 з якіх ужо выкананы. Да дысцыплінарнай адказнасці прыцягнулі двух начальнікаў жыллёва-эксплуатацыйных упраўленняў. Выкананне дванаццаці даручэнняў застаецца на кантролі з ранейшых аналагічных «дзяжурстваў на тэлефоне».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ДАПАМОГА ЛЮДЗЯМ

**Каля трыццаці чалавек выслухаў старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН падчас прамой тэлефоннай лініі.**



Фота БелТА.

Першы патэлефанаваў жыхар Слуцка Андрэй Андрэевіч. Мужчына расказаў, што яго дачка працуе на Старадарожскім пладова-агародніннымі заводзе, які ўваходзіць у склад Слуцкага цукроварафінаднага камбіната. Здавалася б, усё добра, мае работу, а вось заробкі надта нізкія — каля 400 рублёў.

Аляксандр Турчын паведаміў, што хутка на прадпрыемстве з'явіцца новы дырэктар. «Упэўнены, што ён з усім разбярэцца», — дадаў губернатар. Акрамя таго, у пачатку красавіка Аляксандр Турчын выедзе ў Старыя Дарогі, каб сустрэцца з працоўным калектывам і больш дэталёва абмеркаваць сітуацыю.

Жыхар Салігорска расказаў, што ў двары шматкватэрнага кааператыўнага дома па вуліцы Кастрычніцкай прадпрымальнік устанавіў рэкламны шчыт. Адпаведная дамова ёсць з райвыканкамам. Але заяўнік абураны тым, што падатак на зямлю аплачваюць жыхары дома. Прычым з кожным годам ён павялічваецца. «Пытанне сапраўды цікавае, — выказаў меркаванне Аляксандр Турчын, — пагледзім, разбяромся».

Як заўсёды, не абышлося і без зямельных пытанняў. У прыватнасці, Алег Аляксеевіч з Жодзіна паведаміў, што жыве ў прыватным доме, які пабудаваў у 2005 годзе. Але па ўчастку часткова праходзіць лінія электраперадачы, што не дазваляе выкарыстоўваць яго ў поўнай меры — ахоўная зона. Побач з домам — пустка, дзе можна было б выдзеліць плошчу для вядзення падсобнай гаспадаркі. Аднак мясцовыя ўлады на гэта не ідуць. Старшыня аблвыканкама паабяцаў, што на месца выедуць спецыялісты, каб вырашыць пытанне ў межах закона.

Жыхарка Мядзела расказала, што ёй выдзелілі зямельны ўчастак для будаўніцтва дома ў 2018 годзе, бо яна мела патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Аднак тут не было ні камунікацый, ні пад'язных шляхоў. За свой кошт яна падвяла ваду. Але жыць у доме не можа — няма электрычнасці. Жанчына неаднаразова звярталася ў мясцовыя органы ўлады, аднак, як кажуць, воз і сёння там.

Аляксандр Турчын паабяцаў у найбліжэйшы час разабрацца ў сітуацыі. Тым больш што гэта не адзіны выпадак, калі людзям выдзяляюць зямельныя ўчасткі без адпаведных камунікацый. «Не давайце ўчасткі там, дзе не можаце ўладкаваць інфраструктуру», — адзначыў Аляксандр Турчын.

Наталля Рыгораўна з пасёлка Чысць Маладзечанскага раёна выказала незадаволенасць тым, што стала больш плаціць за ацяпленне. Хоць на першы погляд прычын для гэтага няма — нядаўна мадэрнізавалі цеплатрасу, ды і зіма была цёплая. Разам з тым аб'ём спажывання цяпла павялічыўся. Акрамя таго, падчас рамонтных работ была прыбрана лаўка, высечаны дрэвы — і да гэтага часу тут не праведзена добраўпарадкаванне. Аляксандр Турчын даручыў спецыялістам разабрацца ў сітуацыі. Магчыма,

**Аляксандр Турчын паабяцаў у найбліжэйшы час разабрацца ў сітуацыі. Тым больш што гэта не адзіны выпадак, калі людзям выдзяляюць зямельныя ўчасткі без адпаведных камунікацый.**

аб'ём спажывання цяпла павялічыўся ў сувязі з тым, што частка спажыўцоў устанавіла прыборы ўліку цяпла, а лішкі спісваюць на тых, хто не мае лічыльнікаў. Што датычыцца добраўпарадкавання, то мясцовыя службы павінны выправіць сітуацыю да 1 мая.

Алена Мікалаеўна з Барысава купіла кватэру на першым паверсе ў шматпавярховіку, якую перавяла ў нежылое памяшканне. Жанчына хоча адкрыць турыстычнае агенцтва. А вось увесці аб'ект у дзеянне не можа, бо перашкодай аказаўся металічны ганак, што знаходзіцца на зямлі агульнага карыстання.

«Такія выпадкі не адзінкавыя», — канстатаваў Аляксандр Турчын. Ён даручыў землеўпарадкавальнай і архітэктурнай службам вывучыць сітуацыю і дапамагчы людзям.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ЭЛЕКТРАМАБІЛЬ: КВІНТЭСЕНЦЫЯ ТЭХНАЛОГІЙ

**Распрацоўкі беларускага электрамабіля пачаліся ў 2015 годзе. Тады ў краіне давялося літаральна з нуля ствараць новую галіну прамысловасці — а з ёю і навуковую школу. Навукоўцы ведалі падыходы расійскіх, украінскіх калег, валодалі агульнай тэорыяй, але не мелі канкрэтнага досведу праектавання. Так што «бацькі» беларускага электрамабіля — усяго сорак чалавек, супрацоўнікі НДЦ «Электрамеханічныя і гібрыдныя сілавыя ўстаноўкі мабільных машын» Аб'яднанага інстытута машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**

Фактычна сёння ў дзяржструктурах Беларусі цягавымі электрарухавікамі займаюцца толькі ў Цэнтры. А значыць, для многіх прадпрыемстваў менавіта тут вызначаецца перспектыўная прадукцыя. Распрацавалі рухавік — аддалі на Магілёўскі завод «Электрарухавік», зрабілі інвертар ці бартавое зараднае ўстройства — дакументацыя накіроўваецца на завод «Вымяральнік». І гэтая сувязь навукі і вытворчасці непарыўная.

## ЭЛЕКТРЫЧНАЯ ДЫЕТА

Па трасах нашай краіны адлегласць паміж электразапраўкамі складае каля 90 кіламетраў. У новых электрамабіляў прабег на адной зарадцы можа дасягаць трохсот кіламетраў у залежнасці ад рэжыму іх эксплуатацыі. Рэальны дыяпазон — 200–250 кіламетраў.




«Гэтае пытанне можа быць вырашана, можна зрабіць і пяцьсот кіламетраў, і колькі заўгодна. Але гэта пытанне кошту аўтамабіля. Цана батарэі складае, як правіла, ад 30–50 працэнтаў цаны аўтамабіля, адпаведна, чым большая батарэя, тым даражэйшая будзе машына», — тлумачыць **начальнік навукова-даследчага цэнтра Аляксандр БЯЛЕВІЧ.**

Тут уступае ў правы ўжо не фізіка, а эканоміка: калі электрамабіль выйдзе на рынак, беларускі вытворца будзе гатовы пад заказ кліента фарміраваць любую ёмістасць акумулятара.

Як паведаміў Аляксандр Бялевіч, тэарэтычна зарадзіць электрамабіль на 60 % можна хвілін за дваццаць, але пры гэтым рэсурс батарэі рэзка скарачаецца.

«Можна чалавека накарміць за хвіліну, упіхнуць буханку хлеба, вобразна кажучы, але тады ён будзе адчуваць сябе некамфортна. Тое самае з батарэяй. Каб яна камфортна заражалася, патрабуецца не менш за дзве гадзіны. Тады яна забяспечыць рэсурс эксплуатацыі, на які разлічана, — пяць—дзесяць гадоў», — праводзіць аналогію вучоны.

Такім чынам, сапраўды, пакуль што электрамабілі не разлічаныя на падарожжы ў тысячы кіламетраў. Таму на першы план выходзяць акуратнае планаванне маршруту і беражлівае стаўленне да батарэі. Хуткая зарадка — гэта экстранная дапамога.

## БЕНЗІН + ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ = ?

Здаецца, выхад якраз у «гібрыдызацыі»: гадзіну ехаць на паліве, гадзіну — на электраэнергіі. І такія аўтамабілі ёсць — з рухавіком унутранага згарання і накапляльнікам. Але, папершае, такая машына нашмат больш складаная за «чысты» электрамабіль канструктыўна, а па-другое, тыя ж прэферэнцыі, прадугледжаныя Указам Прэзідэнта аб стымуляванні выкарыстання электрамабіляў, на яе не пашыраюцца.

Згодна з указам, уладальнікі электрамабіляў вызваляюцца ад выплаты пошліны за выдачу дазволу на допуск да ўдзелу ў дарожным руху, не выплачваюць ПДВ пры ўвозе электрамабіляў для асабістага карыстання і да 2026 года вызваляюцца ад платы за паркоўку ў спецыяльна абсталяваных месцах на камунальных аўтамабільных паркоўках. Указ прадугледжвае права вытворцаў электрамабіляў і электразарадных станцый, арганізацый, якія эксплуатуюць іх, ужываць павышаныя інвестыцыйныя вылік. Вызвалены ад ПДВ і зарадныя станцыі ў выпадку іх выкарыстання ў Беларусі.

«Ёсць яшчэ мадыфікацыя электрамабіля з так званымі «пашыральнікамі прабегу» — дадатковым модулем, бенза- ці дызель-генератарам. Ён выпрацоўвае падчас руху электраэнергію, але займае пэўны аб'ём багажніка», — разважае Аляксандр Бялевіч.

Больш за тое, першапачаткова на гэту ідэю і быў нацэлены Цэнтр: з шэрагу прычын менавіта «гібрыдны» аўтамабіль цікавы камерцыйнаму сегменту. А вось у грамадстве ён застаўся незапатрабаваны, бо яўных пераваг патэнцыйныя ўладальнікі не адчуваюць.



Кампаненты сілавой установкі беларускай распрацоўкі.

## ДАРАГАЯ МАЯ МАШЫНА

Нават ва ўмовах патаннення нафты Аляксандр Бялевіч прагназуе павелічэнне попыту на электрамабілі для службаў дастаўкі, грузаперавозак, пасажырскага і камунальнага транспарту. З другога боку, наўрад ці ў найбліжэйшы час беларусы без дадатковай стымуляцыі кінуліся б набываць іх ва ўласнасць. Цана...

У свеце машыны на электрычнай цязе выпускаюцца альбо ў класе «люкс», альбо ў надзвычайна эканомным «эканоме». Напрыклад, Zotye прапаноўвала малалітражку за 26 тысяч долараў. Зразумела, што за гэтыя грошы пакупнік аддаў бы перавагу новаму паліўнаму аўтамабілю... дарожніку.

## НА СУСВЕТНЫ ЎЗРОВЕНЬ

«У пачатку года мы падпісалі дарожную карту з кампаніяй Joylong, якая прадугледжвае выхад на зборачную вытворчасць з лакалізацыяй. Стварыць электрамабіль (і ўвогуле любы аўтамабіль) з нуля — вельмі і вельмі дарагое задавальненне, перш за ўсё праз укладанні ў тэхналагічную аснастку», — падкрэслівае Аляксандр Бялевіч.

Таму былі знойдзены партнёры, якія згадзіліся на выкарыстанне беларускім бокам уласнай элементнай базы. І цяпер нашы спецыялісты сканцэнтраваліся менавіта на распрацоўцы кампанентаў сілавой установкі — а гэта вырабы з найбольшай дабаўленай вартасцю. Танней за кітайскія не атрымаецца, але грошы застануцца на радзіме. Плюс магчымасць рабіць розныя мадыфікацыі і ўкараняць тэхналогіі ў традыцыйным для Беларусі сектары машынабудавання.

Беларускі электрычны 7-месны мінівэн масай 3,5 тоны будзе прапаноўвацца ў асноўным для эксплуатацыі ў арганізацыях. Ён можа пастаўляцца як у чыста пасажырскім ці грузавым, так і ў змешаным выкананні. Прадстаўленне аўтамабіля з лакалізаванымі кампанентамі запланавана на сёлета. Цяпер праходзіць паэтапнае замяшчэнне кампанентаў на «донарскім» шасі — у НДЦ распрацаваны рухавік, інвертар, электроніка для акумулятарных батарэй. Калі ўсё будзе добра, ужо ў 2022 годзе навінка можа паступіць у продаж.

А вось чарговы электрамабіль можа быць цалкам беларускі, створаны па каркаснай тэхналогіі. Сёння спецыялісты над ім ужо працуюць.

Яшчэ адна інавацыя ў цэнтры — работа па рэдуктарах, неабходных для сучасных электрамабіляў. Аляксандр Бялевіч лічыць выраб рэдуктараў высокага класа дакладнасці актуальнай праблемай. Гэта электробусу ўсё роўна, колькі важыць яго рухавік, а легкавы аўтамабіль ставіць задачу выкарыстаць усё самае мініяцюрнае, але пры гэтым — таннае. Сапраўды, электрамабіль — квінтэсенцыя тэхналогій грамадства, якое яго стварыла.

**Варвара МАРОЗАВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### ❍ ДАРЭЧЫ

Імпульс развіццю электратранспарту ў краіне надаў Прэзідэнт Беларусі на нарадзе з кіраўніцтвам Савета Міністраў.

«Нягледзячы на тое, з цаной на нафту і, адпаведна, на паліва дакажае, што электратранспарт валодае каласальным патэнцыялам... Усе краіны, такія, як мы, — экспартаарыентаваныя, якія не маюць пад зямлёй велізарных запасаў, — даўно сарыентаваліся на электратранспарт», — сказаў тады Аляксандр Лукашэнка.

Па аператыўных звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі аб паліўна-энергетычных балансах, летась у нашай краіне выраблена 39 844 мільёны кілават-гадзін, а расходавана — 37 506 мільёнаў.

Да таго ж хутка ў Беларусі пачне працаваць атамная электрастанцыя. І пры наяўным лішку электрычнай энергіі ўхіл у бок электратранспарту і ўвогуле большага выкарыстання электраэнергіі як замены вуглевададародаў — самае лагічнае, што толькі можна прыдумаць.

---

## Фінансавы складнік

# ГРОШЫ БУДУЦЬ ВЕРНУТЫЯ Ў ПОЎНЫМ АБ'ЁМЕ...

**У цяперашні час з-за неспрыяльнай эпідэміялагічнай абстаноўкі многія арганізацыі гандлю і сэрвісу вымушаны вяртаць грашовыя сродкі за аплачаныя раней тавары, якія так і не былі дастаўлены кліентам, і паслугі, якія так і не былі аказаны.**

У сувязі з гэтым прэс-служба Нацыянальнага банка краіны звяртае ўвагу на тое, што ў выпадку, калі арганізацыя гандлю (сэрвісу) гатовая вярнуць свайму кліенту грашовыя сродкі, раней выплачаныя пры дапамозе банкаўскай плацежнай карткі, такую аперацыю неабходна аформіць шляхам ажыццяўлення аперацыі вяртання ў плацежным тэрмінале. У гэтым выпадку кліенту будуць вернутыя яго грашовыя сродкі, а арганізацыі гандлю — раней выплачанае ўзнагароджанне за аказаныя паслугі эквайрынгу (у тым ліку інтэрнэт-эквайрынгу).

Таксама эксперты рэгулятара паведамляюць, што цяпер праводзяцца работы па ўкараненні ў АРІП падобнага сэрвісу, які дазволіць кліентам ажыццяўляць вяртанне плацяжоў, зробленых у безнаяўнай форме, з дапамогай сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання, а арганізацыям гандлю (сэрвісу) — раней выплачанае імі ўзнагароджанне. Такі сэрвіс будзе рэалізаваны на працягу некалькіх месяцаў, падрабязную інфармацыю аб парадку яго выкарыстання паведамяць пазней.

Пры гэтым спецыялісты нагадваюць, што ў АРІП ужо рэалізаваны механізм вяртання ў поўным аб'ёме плацяжоў за жыллёва-камунальныя паслугі. Для гэтага неабходна падаць заяву аб вяртанні залішне (памылкова) выплачанай сумы ў арганізацыю, якая ажыццяўляе ўлік, разлік і налічэнне платы за жыллёва-камунальныя паслугі (разлікова-даведачны цэнтр). Пасля разгляду заявы грошы будуць вернуты плацельшчыку.

# НЕБЯСПЕЧНЫЯ ФЭЙКІ

### Ашуканцы, выкарыстоўваючы вядомыя арганізацыі і сайты, зноў актывізаваліся

**Прэс-служба Беларусбанка папярэджвае сваіх кліентаў аб тым, што іх спецыялісты не запускалі платформу для дыстанцыйнага заробку. А справа вось у чым: нядаўна ў сеціве зноў з'явіўся інтэрнэт-рэсурс, уладальнікі якога, карыстаючыся таварным знакам ААТ «ААБ Беларусбанк», збіраюць асабістыя звесткі карыстальнікаў.**

Сайт, размешчаны па адрасе http://bel-program.com/, з'яўляецца падробленым, не мае нічога агульнага з «Беларусбанкам». Акрамя таго, у структуры холдынга Беларусбанка адсутнічае дачэрняе прадпрыемства «Беларусбанк-Інвест».

Пра названы сайт банк ужо папярэджваў кліентаў. Аднак зламыснікі пайшлі далей і гэтым разам распаўсюджваюць інфармацыю аб платформе праз падробленую старонку, знешне падобную на афіцыйны рэсурс www.tut.by. Кліенты банка, не разабраўшыся, што гэта за старонка, вераць фэйку.

| Сведения о предмете аукциона, место нахождения имущества | Имущество по ул. Уборевича, 109 в г. Минске и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для обслуживания недвижимого имущества.<br>В состав имущества входят:<br>***недвижимое имущество:***<br>- капитальное строение с инвентарным номером 500/С-1009559 (наименование – стационарная автогазозаправочная станция), расположенное в г. Минске по ул. Уборевича, 109, общая площадь здания АГЗС составляет 39,6 кв. м, год постройки – 2009;<br>составные части и принадлежности: технологический трубопровод СУГ к технологическому оборудованию, проезд, площадки, пешеходная дорожка и бордюр 0,08, очистные сооружения, сети хозяйственно-бытовой и ливневой канализации, резервуары СГУ (закрытая площадка резервуаров СУГ), ограждение, два резервуара, хозяйственно-питьевая водопроводная сеть, кабельная сеть наружного освещения, кабельная линия, газопровод;<br>- газон;<br>***движимое имущество, относящееся к основным средствам:***<br>- насос SKC 4.08.5.1160 LPG, система видеонаблюдения, машина электр. контрольно-кассовая МСК-4, две топливораздаточные колонки 6000Р, измеритель плотности, комплект «АИИСУТПОН Берлио», два шкафа для инвентаря ШКИ-1700.900.1950, сервис-блок ДС105 с электронным интерфейсом, декоративно-рекламное оформление, внеплощадочные сети электроснабжения, внеплощадочные сети связи | Имущество по ул. Наполеона Орды, 10 в г. Минске и право заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для обслуживания недвижимого имущества.<br>В состав имущества входят:<br>***недвижимое имущество:***<br>- капитальное строение с инвентарным номером 500/С-1014570 (наименование – стационарная автогазозаправочная станция), расположенное в г. Минске по ул. Наполеона Орды, 10, общая площадь здания АГЗС составляет 50,7 кв. м, год постройки – 2012;<br>составные части и принадлежности: технологический трубопровод, технологический трубопровод СУГ к технологическому оборудованию, телефонная канализация, въезд и проезд, дорожка и площадки, очистное сооружение, информационный щит, стела, ливневая канализационная сеть, ограждение резервуарного парка, ограждение площадки под мусоросборники, два резервуара, ворота, контрольный кабель, сеть наружного освещения, внутриплощадные сети электроснабжения, хозяйственно-питьевая водопроводная сеть, хозяйственно-фекальная канализационная сеть, газон, сеть видеонаблюдения;<br>- капитальное строение с инвентарным номером 500/С-1019766, расположенное в г. Минске по ул. Наполеона Орды, 10; протяженность газопровода – 93 м, год постройки – 2012;<br>***движимое имущество, относящееся к основным средствам:***<br>- внеплощадные сети электроснабжения, внутриплощадные сети автоматизации, два насосных агрегата corken fd-150, сервис-блок ДС 105, топочная, система видеонаблюдения, две колонки раздаточных pg-6000р, система измерительная «Струна», пожарная сигнализация, терминал кассовый «БИС-2000» с ППП «АРМ оператора АЗС» вер. 9, оборудование системы «АИИСУ ОН Берлио», сейф типа СМ КС |
| Начальная цена предмета аукциона | 2 005 336 рублей 20 копеек (с понижением начальной цены продажи на 20 %), из них: начальная цена недвижимого имущества – 1 904 558 рублей 1 копейка, начальная цена движимого имущества, относящегося к основным средствам, – 9 488 рублей 42 копейки, начальная цена права заключения договоров аренды земельных участков – 91 289 рублей 77 копеек | 1 649 041 рубль 98 копеек (с понижением начальной цены продажи на 20 %), из них: начальная цена недвижимого имущества – 1 554 667 рублей 86 копеек, начальная цена движимого имущества, относящегося к основным средствам, – 31 291 рубль 2 копейки, начальная цена права заключения договоров аренды земельных участков – 63 083 рубля 10 копеек |
| Продавец недвижимого имущества | Производственное республиканское унитарное предприятие «МИНГАЗ», тел. (017) 299 28 06.<br>Осмотр имущества потенциальными покупателями производится с участием представителей продавца – Кашубы Дмитрия Александровича, конт. тел. (029) 699 59 94 | |
| Информация о земельных участках для обслуживания продаваемого недвижимого имущества | Земельный участок площадью 0,3773 га с кадастровым номером 500000000002003108, в том числе с ограничениями в использовании земель: 0,0432 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения; 0,0034 га – охранная зона линий связи и радиофикации; 0,0472 га – охранная зона сетей и сооружений канализации;<br>вид вещного права на земельный участок – право аренды, срок аренды – 5 лет со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признании аукциона несостоявшимся | Земельный участок площадью 0,1878 га с кадастровым номером 500000000005007084, в том числе с ограничениями в использовании земель: 0,0110 га – охранная зона линий связи и радиофикации; 0, 0048 га – охранная зона линий электропередачи; 0,0269 – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения; 0,0334 га – охранная зона сетей и сооружений канализации; 0,0004 га – охранная зона сетей и сооружений газоснабжения;<br>земельные участки площадью 0,0204 га с кадастровыми номерами 500000000005007085 и 500000000005007086 (в красных линиях), в том числе с ограничениями в использовании земель: 0,0117 га – охранная зона линий электропередачи; 0,0194 га – охранная зона сетей и сооружений газоснабжения; 0,0010 га – охранная зона сетей и сооружений канализации |
| Условия, связанные с использованием земельных участков, а также иные условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона | Направление возможного использования земельного участка – согласно регламентам генерального плана г. Минска, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 23 апреля 2003 г. № 165 «Об утверждении генерального плана г. Минска и некоторых вопросах его реализации», земельный участок по ул. Уборевича, 109 находится в зоне жилой многоквартирной застройки (109Жм). В соответствии с градостроительным проектом детального планирования в границах ул. Чижевских – граница ландшафтно-рекреационной зоны 125ЛР-2 – ул. Голодеда – ул. Ташкентская – ул. Уборевича – МКАД (внесение изменений), утвержденным решением Мингорисполкома от 5 июля 2019 г. № 1936, земельный участок по ул. Уборевича, 109 находится в границах коммунально-обслуживающей территории (П4-ко), предлагается сохранение автозаправочной станции, ул. Уборевича, 109 (РУП «МИНГАЗ».<br>Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:<br>- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона или признании аукциона по продаже объектов государственной собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Мингорисполкомом рассрочки ее внесения);<br>- в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него;<br>- обеспечить пользование предоставленным земельным участком в соответствии с целевым назначением и условиями его предоставления, осуществлять комплекс мероприятий по охране земель;<br>- вносить арендную плату в соответствии с действующим законодательством;<br>- земельный участок, предоставленный в аренду, по миновании надобности, но не позднее срока, на который он предоставлен, возвратить в состав земель города Минска в состоянии, пригодном для дальнейшего использования по назначению, путем направления в Мингорисполком соответствующего ходатайства или в случае необходимости продлить срок аренды им, обратившись в Мингорисполком не позднее чем за три месяца до окончания установленного срока;<br>- при продлении срока аренды земельного участка до истечения срока аренды обратиться в установленном порядке за государственной регистрацией продления права | Направление возможного использования земельных участков – согласно регламентам генерального плана г. Минска, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 23 апреля 2003 г. № 165 «Об утверждении генерального плана г. Минска и некоторых вопросах его реализации», земельные участки по ул. Наполеона Орды, 10 находятся в зоне жилой многоквартирной застройки (165Жм). В соответствии с градостроительным проектом детального планирования жилого района Дружба (Брилевичи) в границах пр-та Дзержинского – МКАД – ж/д Лошицкая водная система (внесение изменений), утвержденным решением Мингорисполкома от 3 марта 2016 г. № 555, земельные участки по ул. Наполеона Орды, 10 находятся в границах коммунально-обслуживающей территории районного значения, предлагается сохранение автоматизированной газозаправочной станции.<br>Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:<br>- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона или признании аукциона по продаже объектов государственной собственности и права заключения договора аренды земельных участков для обслуживания недвижимого имущества несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельных участков (часть платы – в случае предоставления Мингорисполкомом рассрочки ее внесения);<br>- в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельных участков обратиться в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельных участков, прав, ограничений (обременений) прав на них;<br>- обеспечить пользование предоставленными земельными участками в соответствии с целевым назначением и условиями их предоставления, осуществлять комплекс мероприятий по охране земель;<br>- вносить арендную плату в соответствии с действующим законодательством;<br>- земельные участки, предоставленные в аренду, по миновании надобности, но не позднее срока, на который они предоставлены, возвратить в состав земель города Минска в состоянии, пригодном для дальнейшего использования по назначению, путем направления в Мингорисполком соответствующего ходатайства или в случае необходимости продлить срок аренды ими, обратившись в Мингорисполком не позднее чем за три месяца до окончания установленного срока;<br>- при продлении срока аренды земельных участков до истечения срока аренды обратиться в установленном порядке за государственной регистрацией продления права |
| Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета | 401 000 рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с BY13AKBB36429000008700000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 100048181 комитета государственного имущества Мингорисполкома,<br>**назначение платежа – задаток для участия в аукционе** | 329 000 рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с BY13AKBB36429000008700000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 100048181 комитета государственного имущества Мингорисполкома,<br>**назначение платежа – задаток для участия в аукционе** |

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, ул. Герцена, 2А, каб. 2, по рабочим дням с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений – 4 мая 2020 г. до 16.00.**

Для участия в аукционе организатору аукциона подается заявление на участие в аукционе по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе заявитель (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

копия договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

По заявлению победителя аукциона (единственного участника несостоявшегося аукциона) Минским городским исполнительным комитетом предоставляется рассрочка внесения платы за право заключения договоров аренды земельных участков. Указанное заявление подается победителем аукциона (единственным участником несостоявшегося аукциона) в Минский городской исполнительный комитет не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона (далее – протокол). Решение о предоставлении рассрочки внесения платы за право заключения договоров аренды земельных участков принимается Минским городским исполнительным комитетом в течение 5 рабочих дней со дня получения заявления о предоставлении рассрочки.

Рассрочка внесения платы за право заключения договоров аренды земельных участков предоставляется в порядке, установленном решением Минского городского исполнительного комитета от 30.04.2009 № 1015 «Об утверждении Инструкции о порядке внесения платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения Минским городским исполнительным комитетом) за право заключения договоров аренды земельных участков, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельных участков. Размер возмещаемых затрат доводится до сведения участников аукциона до начала его проведения.

После совершения победителем аукциона (единственным участником несостоявшегося аукциона) указанных действий и представления организатору аукциона, продавцу и в Минский городской исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи имущества. В тот же срок Минский городской исполнительный комитет передает победителю аукциона (единственному участнику несостоявшегося аукциона) выписку из решений об изъятии земельных участков и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает экземпляр протокола и заключает с ним договора аренды земельных участков.

Рассрочка оплаты недвижимого имущества на срок не более одного года со дня заключения договора купли-продажи с ежемесячной индексацией платежей может быть предоставлена при заключении договора купли-продажи по решению продавца по согласованию с соответствующим государственным органом.

Информация об аукционе и предмете аукциона дополнительно размещена на официальных интернет-порталах Минского городского исполнительного комитета (**www.minsk.gov.by**) и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (**www.gki.gov.by**).

# Пайшоў, каб застацца

З Леанідам Левіным, славутым нашым архітэктарам, мяне пазнаёміў Генадзь Бураўкін — яго даўні, харошы сябра. Мы прыйшлі на кватэру да Леаніда Мендэлевіча перад самым Новым годам і, натуральна, апынуліся за гасцінным сталом. І таму замест пятнаццаці-дваццаці хвілін, як меркавалі, прагаварылі больш за дзве гадзіны. Але, па праўдзе кажучы, і не заўважылі, як прабег гэты час.

Пасля ў мяне з Левіным было яшчэ некалькі сустрэч, ужо не гасцявых, а чыста рабочых. Дзевяць гадзін запісу на маім дыктафоне — таму яскравае сведчанне.

Уражанне ад тых сустрэч засталося надзвычай прыемнае. Сям'я сапраўдных інтэлігентаў, таленавітых людзей. Галоўны ў сям'і, яе эпіцэнтр — канешне ж, Леанід Мендэлевіч. І не толькі таму, што мае безліч званняў і ўзнагарод, але і з прычыны свайго шматграннага таленту. Тое, што ён напісаў дзве выдатныя кнігі — «Хатынь» і «Война и любовь», — я ведаў. І, зразумела, уважліва іх прачытаў. А вось што ён піша вершы, дазнаўся выпадкова. Ужо заканчваючы нашу гутарку, я пацікавіўся: «Пра што я ў вас яшчэ не папытаўся? Пра што вам хацелася б расказаць?» І Леанід Мендэлевіч, саромеючыся, бянтэжачыся, прызнаўся, што хацеў бы паказаць свае хоку, ці, як ён іх называе, хайкі — паэтычныя двух- і трохрадкоўі, якіх у яго сабралася ўжо, мусіць, больш за тысячу — два аб'ёмістыя сшыткі. Сталі чытаць — сярод звычайных, прахадных радкоў ёсць і па-сапраўднаму таленавітыя, з цікавымі вобразамі, нечаканымі метафарамі, з паэтычным бачаннем свету.

— Дык гэта ж гатовая кніга паэзіі! — міжволі ўсклікнуў я.

— Ну што вы... — зноў збянтэжыўся Леанід Мендэлевіч. — Які з мяне паэт. Так, балаўство...

— А ты пакажы сваю кнігу «1, 2, 3, 4...», — прапанавала раптам жонка, Наталля Мікалаеўна, якая падчас гэтай размовы была якраз побач.

— Дык гэта ж трэба яшчэ шукаць.

— Я зараз знайду сама... Вось, калі ласка. Пачытайце хоць бы «Вясну ў Бад-Аэнхаўзене».

— А можна я пачытаю ўголас?

— Ну, калі ласка... — Леаніду Мендэлевічу, адчувалася, было няёмка, што яго паэтычным спробам надаецца гэтулькі ўвагі. Але адначасова, відаць, і хацелася, каб я ўсё ж пачытаў, сказаў сваё слова.

Пасля чытання колькі хвілін мы ўсе трое, усхваляваныя, маўчым. Я чую, як гулка б'ецца ў грудзях маё сэрца. Боль, трагедыю яўрэйскага народа, якія так глыбока, пранікнёна-эмацыянальна былі выказаны ў толькі што прачытаных радках, яно ўспрыняло як свае ўласныя.

Яшчэ болей узрушаны Леанід Мендэлевіч. Падчас чытання краем вока я бачыў, як твар ягоны то напружана хмурнеў, то свяціўся кранальнай пяшчотаю, то зноў пакутліва наструньваўся. Ён як бы занава перажываў той настрой, што валодаў ім пры напісанні гэтых журботна-трапяткіх, прачулых радкоў. У рэшце рэшт Леанід Мендэлевіч не вытрымаў — перасеў ад стала ў крэсла, якое стаяла непадалёку, і там, самотна-прыціхлы, аддаўся сваім гаротна-збалелым пачуццям...

Я запытальна паглядзеў на Наталлю Мікалаеўну: можа, Леаніду Мендэлевічу кепска? Ён жа нядаўна перанёс інсульт і яшчэ не зусім ачуняў ад цяжкай хваробы. Яму нельга хвалявацца...



Фота БелТА.

Леанід Левін на адкрыцці мемарыяла ў Чырвоным Беразе, 2007 год.

Але Наталля Мікалаеўна кіўком галавы супакоіла мяне: усё нармальна, хай муж пабудзе трохі ва ўладзе сваіх думак — і далікатна перавяла гаворку на іншае.

Дарэчы, не магу не сказаць колькі слоў пра саму Наталлю Мікалаеўну. Яна — таксама архітэктар. Таленавіты архітэктар. У сталіцы пабудавана некалькі адметных будынкаў па яе праектах. Апошнім часам працавала ў калектыве, які ствараў новую канцэпцыю генеральнага плана Мінска пад кіраўніцтвам Юрыя Пурэцкага. Калектыў за цікавую і арыгінальную распрацоўку першай чаргі будаўніцтва атрымаў прэмію Савета Міністраў СССР. У ліку ўзнагароджаных была і яна, Наталля Мікалаеўна.

А яшчэ Наталля Мікалаеўна і Леанід Мендэлевіч — заядлыя калекцыянеры. Кватэра Левіных нагадвае своеасаблівы музей. Усе тры пакоі і нават кухня ад падлогі да столі ў розных паліцах, палічках, падстаўках, на якіх размешчаны сотні і сотні — не хочацца казаць экспанатаў — прадметаў мастацтва. Так, кожны з іх — выдатны ўзор майстэрства і высокага мастацтва. А ўсе разам яны, гэтыя застылыя імгненні свайго часу, ствараюць адзіную хвалюючую поліфанічную музыку Вечнасці.

— Я люблю ўсё гэта... — крыху няёмячыся, прызнаецца Леанід Мендэлевіч, калі мы застаёмся ўдвух. — Люблю сваю кватэру. Свой кабінет. Гэту ўтульнасць, сямейны спакой. Хоць, на вялікі жаль, бываю дома даволі рэдка. Асабліва раней. Здаралася, суткамі не выходзіў з майстэрні. Жонка аднойчы напаўжартам, напаўсур'ёз паскардзілася ў маёй прысутнасці свайму бацьку, што рэдка мяне бачыць дома. Але мой мудры цесць толькі ўсміхнуўся і сказаў:

— Трэба было выходзіць замуж за бухгалтара. Пасля шасці ён заўсёды быў бы дома...

— А ўвогуле, — кажа Леанід Мендэлевіч, — мне пашанцавала з жонкай. Яна — мой надзейны тыл. Многім, вельмі многім у сваіх творчых поспехах я абавязаны менавіта ёй — майму сябру, майму аднадумцу, майму анёлу-ахоўніку.

Кажа і прыкметна бянтэжыцца:

— Прабачце за пафас. Я не люблю высокіх, гучных слоў. Але гэта — чыстая праўда.

Я ўжо чацвёрты раз у кватэры Левіных, правёў з імі добры дзясятак гадзін і магу пацвердзіць справядлівасць такой ацэнкі. Тая атмасфера, тая аўра ўтульнасці, цеплыні, добразычлівасці, якая ахутвае госця літаральна з першых хвілін, зыходзіць найперш ад яе, Наталлі Мікалаеўны — мілай, абаяльнай, гасціннай гаспадыні. Свае літаратурныя творы Леанід Мендэлевіч расцэньвае як аматарства, як своеасаблівае хобі і прызнаецца, што ў гэтай сферы адчувае сябе не зусім упэўнена. Таму калі яго кнігі хваляць (а хваляць вядомыя пісьменнікі!), ён няёмкіцца і лічыць, што ягоныя здольнасці ў гэтым перабольшваюць.

Іншая справа — архітэктура. Тут Леанід Мендэлевіч дакладна ведае цану і сваім уласным работам, і работам сваіх калег. Права на строгую, бескампрамісную ацэнку даюць яму не толькі высокія ўзнагароды (званні заслужанага архітэктара рэспублікі, лаўрэата Ленінскай прэміі і Дзяржаўных прэмій Беларусі, акадэміка архітэктуры), але і высокая планка зробленага.

І кожны з гэтых аб'ектаў прапушчаны Майстрам праз сэрца, амаль кожны пакінуў на ім свой рубец. І гэта не журналісцкі штамп, не банальная метафара. Гэта — суровая рэальнасць. Леанід Мендэлевіч перажыў чатыры інфаркты, перанёс дзве цяжкія кардыялагічныя аперацыі. А колькі гадоў таму здарылася яшчэ адна бяда — інсульт, ачуняць ад якога канчаткова яму так і не ўдалося.

Але пра гэта Леанід Мендэлевіч гаварыць не любіў. І нават самому сабе не дазваляў думаць пра нейкія там балячкі. Кожны дзень, як і раней, — увесь у клопатах, у творчых пошуках, у віры грамадскай дзейнасці.

А тут яшчэ я са сваімі бясконцымі пытаннямі, уедлівымі роспытамі. Але ні разу, ні на імгненне я не адчуў з боку Леаніда Мендэлевіча нейкай адчужанасці, абыякавасці, стомленасці, не мільганула на твары і цені якога-небудзь раздражнення, нецярплівасці. На працягу ўсіх нашых сустрэч і размоў — пастаянная ўвага, нязменная добразычлівасць, ветлівасць, поўная адкрытасць і шчырасць.

## ЖЫВАЯ ВАДА ТВОРЧАСЦІ

У 2011 годзе Леанід Левін стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Беларусі за мемарыял «Дзецям — ахвярам Вялікай Айчыннай вайны». Я папрасіў расказаць, чыя была ідэя гэтага мемарыяла? Як ён ствараўся?

— Ідэя была мая. Я сам яе прыдумаў і сам увасабляў у жыццё. Гучыць трохі пафасна, прабачце. Словам, было так. Дзяцінства маё прыйшлося на вайну, і яе болі, яе трывогі не абышлі і мяне. Я даўно марыў нейкім чынам увекавечыць памяць дзяцей, да якіх вайна дакранулася сваім крывавым крылом. Ідэю кіраўніцтва краіны ўхваліла.

Сталі шукаць месца для будаўніцтва. Чамусьці рашылі, што яно павінна быць пад Мінскам. Таму першую пляцоўку выбралі непадалёк ад кальцавой, па дарозе на Хатынь. Цяпер там катэджны пасёлак.

Я выязджаў туды і раз, і другі, глядзеў, глядзеў, але выбранае месца душа чамусьці не прымала. Па-першае, занадта блізка ад горада, з двух бакоў ажыўленая, шумная траса, а мемарыял патрабаваў засяроджанай, удумлівай цішыні. Па-другое, і гэта самае галоўнае, ні тут, ні дзе паблізу ў гады вайны не было ніякага канцлагера. У мяне ж была задума стварыць менавіта мемарыял.

Я тады пайшоў у музей Вялікай Айчыннай вайны, і яго супрацоўнікі далі мне спіс усіх дзіцячых канцлагераў, якія арганізавалі фашысты на тэрыторыі Беларусі. І я праехаў, агледзеў усе адзінаццаць. І спыніўся на Чырвоным Беразе, што пад Жлобінам. Месца гэтае кранула мяне сваёй хвалюючай цішынёй, сваім тужлівым хараством.

Але што значыць — я спыніўся? Патрэбна ж яшчэ рашэнне мясцовых улад. Партыйных органаў ужо не было. Пайшоў я да старшыні Жлобінскага райвыканкама. Прозвішча яго, прабачце, ужо забылася, але добра памятаю, што мне вельмі лёгка ўдалося ўгаварыць гэтага інтэлігентнага чалавека не толькі будаваць мемарыял, але і размясціць яго не каля самай дарогі, а ў вялікім яблыневым садзе.

Агульнымі намаганнямі мемарыял давялі да ладу. Экспертная камісія Міністэрства культуры ацаніла яго надзвычай высока. А мы са скульптарам Аляксандрам Фінскім, які выканаў фігуру дзяўчынкі, атрымалі Дзяржаўную прэмію Беларусі.

...Леанідам Левіным было створана яшчэ некалькі работ, прысвечаных падзеям мінулай вайны. Так, у Маладзечне ёсць мемарыял «Шталаг-342», прысвечаны памяці савецкіх ваеннапалонных, закатаваных фашыстамі. У Докшыцкім раёне, на месцы спаленай карнікамі вёскі Шунеўка, у суаўтарстве са скульптарам Анатолем Анікейчыкам зроблены помнік «Пракляцце фашызму».

У шэрагу гэтых работ адна з самых значных, на мой погляд, — «Прарыў». Першы помнік гераізму беларускіх партызанаў. Створаны ён пад Ушачамі, што на Віцебшчыне. Менавіта там, сярод балот і лясоў, у гады мінулай вайны дзейнічала шаснаццаць партызанскіх брыгад. Вясной 1944 года яны аказаліся ў нямецкай блакадзе. Супраць народных мсціўцаў фашысты кідаюць групоўку ў шэсцьдзясят тысяч чалавек. Іх наступ падтрымліваюць гарматы, танкі, самалёты. Партызаны ідуць на прарыў. Несучы цяжкія страты, праяўляючы масавы гераізм, выходзяць з акружэння. Вось гэты драматычны момант прарыву, велічны акт мужнасці і гераізму Левін з Анікейчыкам і адлюстравалі сродкамі манументальнага мастацтва.

## ЖАЛОБА І СМУТАК, МУЖНАСЦЬ І ВЕРА

Створанае Леанідам Левіным не можа не ўражваць. Дзясяткі, калі не сотні выдатных архітэктурных праектаў... Усе яны, безумоўна, былі дарагія і блізкія Творцу — як любімыя дзеці. Аднак падчас адной з сустрэч я асмеліўся выказаць меркаванне, што сярод гэтых работ ёсць адна, якая ў яго душы і ў ягонай памяці стаіць асобна. Гэта — мемарыяльны комплекс «Хатынь».

— Так, гэта праўда, — пагадзіўся Леанід Мендэлевіч. — Але не толькі таму, што мы, маладыя тады архітэктары — Юрый Градаў, Валянцін Занковіч і я, — атрымалі за наш праект самую высокую, самую прэстыжную ў краіне ўзнагароду — Ленінскую прэмію. Найперш «Хатынь» помніцца высокім душэўным гарэннем, апантаным пошукам новых ідэй і рашэнняў, надзвычайнай радасцю творчых знаходак. Гэта была ўнікальная, маштабная, сапраўды ўсенародная будоўля, на якую працавала дваццаць пяць заводаў рэспублікі. Ніколі пазней я не адчуваў такой значнасці і такой адказнасці сваёй працы.

— Адкрыццё мемарыяла было шматлюдным, урачыстым?

— Не тое слова. Ведаеце, язык не паварочваецца назваць гэта мерапрыемствам. Гэта была падзея, з'ява ў жыцці рэспублікі.

Пра «Хатынь» загаварылі. Загаварылі як пра з'яву ў мастацтве. З'явіліся шматлікія публікацыі. Былі ўзнёслыя водгукі прафесіяналаў. У мемарыял пацягнуліся экскурсіі. З усіх куткоў Беларусі. З усіх рэспублік Савецкага Саюза. З-за мяжы.

«Хатынь» зажыла сваім, самастойным жыццём. Як сімвал жалобы і смутку, як помнік мужнасці і веры народнай.

* * *

...І вось ужо шэсць гадоў, як Леанід Левін пайшоў у лепшы свет. Днямі я наведаў Наталлю Мікалаеўну. Цяжкая страта, канешне ж, не прыбавіла ёй здароўя. Аднак яна па-ранейшаму прыветлівая, клапатлівая гаспадыня.

— У нашай кватэры, — кажа Наталля Мікалаеўна, — усё як было пры мужу. Мой цяперашні клопат — захоўваць памяць пра Леаніда Мендэлевіча. Ён пайшоў, каб застацца.

**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.**

Жыві і квітней, Беларусь! Кузня чэмпіёнаў

# КАБ ТАЛЕНТЫ НЕ ПРАХОДЗІЛІ МІМА

## Трэнерскія кадры і традыцыі дапамагаюць Кіраўскай СДЮШАР рыхтаваць спартсменаў у зборныя каманды краіны

**Кіраўская спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву летась адзначыла сваё 55-годдзе. За гэты час у яе сценах выраслі прызёры чэмпіянатаў свету і Еўропы па розных відах спорту, сёння больш за дзясятак спартсменаў уваходзяць у спісы зборных Беларусі. Акрамя таго, з выхаванцаў школы ў горадзе сфарміравана прафесійная каманда па пляжным футболе.**



### Сакрэт поспеху — фанатычная адданасць рабоце

Цяпер тут займаецца 387 дзяцей розных узростаў, СДЮШАР культывуе чатыры кірункі — веласіпедны спорт, валейбол, футбол і цяжкую атлетыку. Школа рэгулярна перадае сваіх вучняў у вучылішчы алімпійскага рэзерву па ўсёй краіне.

Мабыць, самым паспяховым відам у плане выніковасці ў Кіраўску з'яўляецца веласіпедны спорт: за апошнія 15 гадоў у сценах школы падрыхтавана каля 15 майстроў спорту, чатыры майстры спорту міжнароднага класа. З 2009 года ні адзін чэмпіянат Еўропы і свету не абыходзіўся без удзелу кіраўчан, а сёння ў зборных краіны па веласпорце выступае адразу восем выхаванцаў СДЮШАР Кіраўска. Сярод іх прызёр этапу Кубка свету і маладзёжнага чэмпіянату Еўропы Раман Ціцкоў — дарэчы, ён ужо зававяў ліцэнзію на Алімпійскія гульні ў Токіа, — двухразовы сярэбраны прызёр маладзёжнага чэмпіянату Еўропы Аксана Салаўёва, Ганна Васількова і іншыя.



Сваіх выхаванцаў **дырэктар спартыўнай школы Сяргей КЛІМОВІЧ** *(на фота)* успамінае з гонарам і цеплынёй. «Абсалютна ўсіх добра памятаю. Рому Ціцкова трэніраваў яго бацька, ён, дарэчы, да гэтага часу працуе ў нас у школе старшым трэнерам. Таму выбару ў Рамана асаблівага не было, бацька цягаў яго на трэніроўкі з самага дзіцячага садка. Цяпер часцей бачым яго па тэлевізары, але спадзяёмся, што пасля каранціну Ціцкоў прыедзе дадому і завітае да нас у школу», — кажа Сяргей Мяфодзьевіч.

Сакрэт выхавання паспяховых спартсменаў просты, упэўнены дырэктар, — гэта трэнерскія кадры, іх фанатычная адданасць рабоце і традыцыі. Але кіраўнік не хавае: нягледзячы на россып вядомых выхаванцаў, праблемы ў школы былі заўсёды, ёсць яны і цяпер. Напрыклад, летась па прэзідэнцкай праграме, якая разлічана на падтрыманне спартыўных школ у рэгіёнах, закупілі новыя веласіпеды, але сёння на ўсіх дзяцей іх усё роўна не хапае. Патрэбныя і машыны, неабходныя для трэніровак веласіпедыстаў на шашы, не кажучы ўжо пра звычайную велаформу, якая каштуе таксама нямала. «Часта даводзіцца набываць яе за свой кошт, шукаць праз знаёмых, дзесьці дапамагаюць дзеці, якія ўжо дамагліся высокага выніку і маюць такую магчымасць», — дзеліцца Сяргей Мяфодзьевіч.

Веласіпедная база знаходзіцца за 10 кіламетраў ад горада. Асноўны кірунак у Кіраўску — гэта шашэйны веласпорт, трэка ў горадзе няма, але, нягледзячы на гэта, выхаванцы школы ў зборнай выступаюць і ў гэтай дысцыпліне.

— Цяпер у веласпорце мы больш арыентаваны на дзяцей з суседніх вёсак і аграгарадкоў, — адзначае дырэктар СДЮШАР. — Але існуе вялікая праблема з транспартам. У маленькіх вёсках агульнаадукацыйныя школы зачыняюцца: цяпер у нашым раёне часта сустракаецца, што працуе адна школа на пяць-шэсць вёсак. Пасля заняткаў школьны аўтобус развозіць дзяцей па дамах, а вось дабрацца да трэніроўкі і назад малым вельмі праблематычна. Ваджу іх сам, на сваёй машыне, але гэта два-тры чалавекі, больш не атрымліваецца. Шмат патэнцыйных чэмпіёнаў з-за гэтага праходзяць міма, а дзеці там вельмі ніздрэнныя.

### Даводзіцца змагацца за дзяцей

Моцныя традыцыі ў Кіраўску і ў валейболе — выхаванцы мясцовай спартыўнай школы таксама прадстаўлены ў зборных камандах нашай краіны. Сёння ў клубах вышэйшай лігі чэмпіянату краіны гуляюць прадстаўнікі Кіраўска — Дзяніс Іваніцкі і Арцём Васількоў. А Віялета Бяляўская, якая пачынала свой спартыўны шлях менавіта ў мясцовай СДЮШАР, з'яўляецца бронзавым прызёрам маладзёжнага чэмпіянату Еўропы ў складзе зборнай Беларусі. Цяпер дзяўчына выступае за найлепшы жаночы клуб краіны — сталічную «Мінчанку».

— Прыцягнуць дзяцей да трэніровак можна, але вось утрымаць іх цяжка, — расказвае **трэнер па валейболе Кіраўскай СДЮШАР Тамара ГРЫГОР'ЕВА.** — У нас у горадзе ўсяго дзве агульнаадукацыйныя школы, а розных гурткоў дастаткова, так што даводзіцца змагацца за дзяцей. Дзесьці працуем праз бацькоў, таму што многія з іх хадзілі да мяне на заняткі, а цяпер ходзяць ужо іх дзеці. Спрабуем утрымаць іх тым, што вывозім на спаборніцтвы, у басейн, у аквапарк — самі з'ездзіць туды могуць не ўсе. Для пачатку нікога не настройваем на прафесійны спорт, а больш скіроўваем на аздараўленчую фізкультуру, потым яны самі ўцягваюцца і ў некаторых вымалёўваецца перспектыва.

Сёння ў школе 10 груп па валейболе, гэта каля ста чалавек, што вельмі ніядрэнна для горада з насельніцтвам 9 тысяч. Ёсць і вясковыя, і гарадскія дзеці — раней вясковых зацікавіць было значна прасцей, зараз да спорту павярнуўся і горад. Для валейбола ў СДЮШАР ёсць свая трэніровачная зала, летась у ёй зрабілі капітальны рамонт. Калі яе не хапае, трэнеры выкарыстоўваюць школьныя спартыўныя залы.

А вось цяжкая атлетыка ў Кіраўску — самы малады від спорту, але і ў гэтым відзе ў мясцовых выхаванцаў ужо ёсць поспехі. Сёлета Дар'я Лазаковіч і Мікалай Бяляўскі сталі бронзавымі прызёрамі чэмпіянату краіны па цяжкай атлетыцы. Сёння яны ўваходзяць у нацыянальную каманду краіны, Дар'я — у асноўны склад, Мікалай — пакуль у рэзервовы. Акрамя гэтага, кіраўская каманда заняла трэцяе месца ў першынстве вобласці. Такія вынікі стымулююць на яшчэ большае развіццё гэтага кірунку. «Цяпер агульнымі намаганнямі будзем спрабаваць пабудаваць у горадзе спецыялізаваную залу цяжкай атлетыкі, ёсць ужо адабрэнне кіраўнікоў, а таксама будзем запрашаць яшчэ больш трэнераў па гэтым відзе спорту», — дзеліцца планамі дырэктар СДЮШАР.

### Падтрымаць маладых і словам, і справай

На адмысловым рахунку і кіраўскі футбол. Сёння ён з'яўляецца самым масавым відам, у школе сфарміравана 15 груп, у тым ліку паспяхова развіваецца і жаночы кірунак — найлепшыя выхаванкі школы пераходзяць гуляць у «Бабруйчанку». Спачатку школа спецыялізавалася на класічным футболе, потым перайшла на футзал, а цяпер яе галоўны кірунак — гэта пляжны футбол, бо штосьці новае заўсёды развіваецца лепш, перакананыя трэнеры і кіраўнік. Прафесійны клуб, «Кіраўск-СДЮШАР», які выступае ў чэмпіянаце краіны, заўсёды трымаецца ў тройцы лідараў. Летась кіраўчане сталі сярэбранымі прызёрамі чэмпіянату і выйгралі Кубак Беларусі, у маі каманда згуляе за суперкубак. Характэрна, што «Кіраўск-СДЮШАР» практычна на сто працэнтаў складаецца з мясцовых выхаванцаў. Гэта, вядома, выклікае непадробную балельшчыцкую цікавасць з боку гараджан, трыбуны мясцовага стадыёна не бываюць пустыя. У спісе нацыянальнай зборнай па пляжным футболе шэсць прадстаўнікоў Кіраўска, на нядаўніх Еўрапейскіх гульнях у Мінску выступалі трое з іх — Вадзім Бокач, Юрый Пятроўскі і Канстанцін Магалецкі. Дарэчы, Вадзім Бокач сумяшчае прафесійную спартыўную кар'еру з трэнерскай работай у мясцовай СДЮШАР.

Наогул з маладымі трэнерскімі кадрамі ў мясцовай школе праблем няма. «Сёння ў нас працуе ў асноўным моладзь. Усе яны свае, усе прайшлі нашу школу, атрымалі вышэйшую або сярэднеспецыяльную адукацыю і вярнуліся дадому, — з гонарам апавядае дырэктар. — Мы стараемся чужых не запрашаць, бо выдатна разумеем, што не змозжам забяспечыць іх жыллём і іншым неабходным. Напрыклад, у веласпорце ў нас працуе малады трэнер Павел Белахвостаў, ён займаўся ў нас, адвучыўся і вярнуўся, дарэчы, адзіны са свайго выпуску ўніверсітэта застаўся працаваць трэнерам».

— Я папрацаваў пару гадоў у Мінску, але вырашыў вярнуцца ў Кіраўск, таму што мне вельмі падабаецца мая работа, а займацца веласпортам у такім горадзе, як наш, значна зручней, — расказвае Павел Белахвостаў. — Наш спорт звязаны з дарогай, у гарадах рух вялікі, а тут і прастору больш, і паветра чысцейшае.

Дырэктар школы згаджаецца, што ўтрымаць маладых спецыялістаў на трэнерскай рабоце сёння даволі складана, але кіраўніцтва імкнецца не толькі забяспечыць настаўнікаў усім неабходным у фінансавым плане, але і падтрымаць у маральным.

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ і з архіва СДЮШАР г. Кіраўска.**

# Хакей заканчваецца, футбол пачынаецца

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра найбольш актуальныя спартыўныя падзеі выхадных.**

**1.** ***Хакеісты «Шахцёра», адолеўшы «Юнацтва» ў другім матчы фінальнай серыі з лікам 3:2, аднавілі раўнавагу перамог і паражэнняў — 1:1.*** Наступныя матчы адбудуцца сёння і заўтра ў Салігорску. Затым паядынкі будуць праходзіць па чарзе на пляцоўках абодвух клубаў да чатырох перамог адной з каманд.

Нагадаем, хакеісты «Юнацтва» з'яўляюцца васьміразовымі чэмпіёнамі краіны, а іх сапернікі ўсяго адзін раз станавіліся ўладальнікамі «золата». У вырашальных серыях за чэмпіёнскі тытул «Юнацтва» і «Шахцёр» гулялі тройчы. Мінчане перамагалі два разы — у 2010 (4:3) і 2016 (4:1) гадах, а ў 2015-м салігорскія хакеісты выйгралі залатую серыю з сухім лікам 4:0.

**2.** ***Другім фіналістам XIII Рэспубліканскіх спаборніцтваў па хакеі з шайбай сярод аматарскіх каманд на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба стала дружына Мінскай вобласці.*** Пуцёўка ў вырашальную стадыю спаборніцтваў была здабыта зборнай Мінскай вобласці ў спрэчцы з камандай Брэсцкай вобласці. Матч, які праходзіў у Баранавічах, завяршыўся з лікам 4:2 на карысць гасцявой дружыны.

У спрэчцы за ганаровы трафей хакейных аматараў гульцы з Мінскай вобласці будуць змагацца з лядовай дружынай Прэзідэнта Беларусі, якая разграміла ў першым паўфінале каманду Гродзенскай вобласці (12:3).

Нагадаем, на папярэдняй стадыі спаборніцтваў каманда Мінскай вобласці атрымала 4 перамогі ў 6 праведзеных матчах, набраўшы 8 ачкоў з 12 магчымых, і заняла трэцяе месца ў турнірнай табліцы. Першае месца пакінула за сабой лядовая дружына кіраўніка дзяржавы, якая атрымала 6 перамог у 6 праведзеных матчах і набрала 12 ачкоў з 12 магчымых.

**3.** ***У чэмпіянаце краіны па футболе адбыліся матчы 2-га тура.*** Футбалісты гродзенскага «Нёмана» абыгралі на сваім полі «Віцебск» з лікам 2:0, «Слуцк» саступіў «Дынама» (Брэст) — 0:1, «Славія» (Мазыр) з мінімальнай перавагай абыграла БАТЭ (Барысаў) — 2:1, «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) быў мацнейшы за «Белшыну» (Бабруйск) — 1:0. Матч «Руху» (Брэст) і «Энергетыка-БДУ» (Мінск) скончыўся з лікам 0:1, «Гарадзея» саступіла «Шахцёру» (Салігорск) — 0:2, «Мінск» перайграў «Дынама» (Мінск) — 3:2, а «Іслач» (Мінскі раён) — «Смалявічы» — 1:0.

Турнірную табліцу ўзначальваюць «Мінск», «Энергетык-БДУ», «Іслач» і «Тарпеда-БелАЗ», якія набралі па шэсць ачкоў з шасці магчымых, чатыры — у дзеючага чэмпіёна брэсцкага «Дынама».

Матчы 3-га тура запланаваныя на 3-5 красавіка.

**4.** ***Жаночая каманда ФК «Мінск» стала ўладальніцай Суперкубка Беларусі.*** У стартавым матчы новага сезона чэмпіёнкі і ўладальніцы Кубка краіны футбалісткі «Мінска» разграмілі сваіх сапернiц з яшчэ аднаго сталічнага клуба «Зорка-БДУ» з лікам 5:0. Цяпер у іх актыве стала шэсць суперкубкаў.

Плануецца, што 29-ы жаночы чэмпіянат Беларусі пачнецца ў сярэдзіне красавіка. Нагадаем, летась сваё сёмае запар «золата» нацыянальнага першынства заваявалі футбалісткі «Мінска», сярэбранымі прызёрамі сталі спартсменкі «Зоркі-БДУ», бронзавыя медалі ў актыве гродзенскага «Нёмана».

**5.** ***Усерасійская федэрацыя валейбола абвясціла аб датэрміновым завяршэнні суперлігі сярод мужчынскіх і жаночых каманд.*** Рашэннем УФВ выніковае становішча каманд вызначана па выніках папярэдняга этапу. Такім чынам, «Мінчанка» другі год запар заняла ў турніры 10-е месца. Нагадаем, беларуская каманда дабілася на папярэднім этапе пяць перамог у 16 матчах.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

# РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

## 9 апреля 2020 года на 6-м открытом аукционе проводит 4-й от 12 марта 2020 года и 5-й от 26 марта 2020 года повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 39 | Специальный автомобиль Урал-43203-01 с кузовом-фургоном К2-4320 в составе: кузов-фургон К2-4320, № 09187, 1990 г., 4 кат. Автошасси Урал-43203-01, ш. 160662, дв. 684996, 1990 г., 4 кат., 1756 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 8 500,00 | 1 700,00 |
| 46 | Грузовой бортовой КамАЗ-43106, ш. ХТС431060L0005418, 1990 г., 104847 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 9 700,00 | 1 940,00 |
| 47 | Грузовой УРАЛ-375АМ, ш. 418649 с кузовом-фургоном К1.375, № 02188, 1984 г., 1130 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 13 600,00 | 2 720,00 |
| 48 | Грузовой УРАЛ-375АМ, ш. 430856 с кузовом-фургоном К1.375, № 11145, 1984 г., 1130 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 13 600,00 | 2 720,00 |
| 49 | Грузовой УРАЛ-375АМ, ш. 428223 с кузовом-фургоном К1.375, № 09147, 1984 г., 1091 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 13 600,00 | 2 720,00 |
| 50 | Грузовой УРАЛ-375АМ, ш. 435252 с кузовом-фургоном К1.375, № 04370, 1985 г., 1086 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 13 600,00 | 2 720,00 |
| 51 | Грузовой УРАЛ-375АМ, ш. 435779 с кузовом-фургоном К1.375, № 05285, 1985 г., 1116 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 13 600,00 | 2 720,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **9 апреля 2020 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 6 апреля 2020 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **9 апреля 2020 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 бел. руб. за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп.1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России № 30101810400000000225, **Без НДС**.

**Справки по тел/факс: (017) 398 05 41.**

*Ранее опубликованное извещение в газете «Звязда» № 23 от 5.02.2020 г. № 32 от 18.02.2020 г.*

---

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

# РУП «Строительно-монтажный трест № 22»

